блем Белорусского государственного университета. Ему принадлежат два официально зарегистрированных открытия: явление ядерной прецессии нейтронов и явление вращения плоскости поляризации жестких гамма-квантов. Им было создано новое научное направление – объёмные лазеры на свободных электронах. Институт под его руководством внес определенный вклад в подготовку экспериментов на адронном коллайдере в Европейском центре ядерных исследований, в том числе по обнаружению бозона Хиггса.

Нет сомнений, что в нашей стране гораздо больше ученых, имеющих достижения мирового уровня, создавших новые институты и научные школы. Однако, на наш взгляд наиболее эффективны для воспитательных целей примеры, хорошо воспринимаемые учащимися старших классов и студентами университетов. При этом, помимо их использования в историческом ракурсе развития науки в Беларуси, имеется возможность прямого внедрения их достижений в учебные программы дисциплин с подчеркиванием авторства наших ученых, а в необходимых случаях и указанием на их успешных учеников, знакомых аудитории.

ЛИТЕРАТУРА

1. Овчаров А. В., Голубь П. Д. Патриотическое воспитание учащейся молодежи на примере жизнедеятельности выдающихся российских ученых-физиков / Проблемы современного образования. 2020, № 3. С. 106–115.

УДК 821.161.3 «1920/1930»

І.У. Каляда, дац., канд. гіст. навук,
(БДТУ, г. Мінск)

## БЕЛАРУСІЗАЦЫЯ 1920-Х ГАДОЎ: ВЫНІКІ І ПРЫЧЫНЫ СКАСАВАННЯ

Беларусізацыя 1920 - х гадоў – палітыка нацыянальна-дзяржаўнага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў БССР, праграма якой уключала перавод на беларускую мову справаводства партыйнага, дзяржаўнага, прафсаюзнага і кааператыўнага апаратаў; вылучэнне беларусаў на партыйную, савецкую, прафсаюзную і грамадскую працу; арганізацыю школ, сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў з выкладаннем на беларускай мове; развіццё беларускай літаратуры, навукова-даследчай працы па ўсебаковаму вывучэнню Беларусі, пашырэнне перыядычнага друку і інш.

Пачалася беларусізацыя 1920-х са справаводства. Для вывучэння супрацоўнікамі партыйна-дзяржаўнага апарата беларускай мовы былі арганізаваны кружкі і курсы беларусазнаўства. Пры ЦВК БССР працавала спецыяльная камісія для праверкі ведання беларускай мовы ва ўрадавых установах рэспублікі. Пэўныя вынікі гэтай працы сталі відавочнымі ўжо ў другой палове 1920-х гг.: калі ў 1925 г. беларускай мовай у цэнтральных органах валодала каля 20 % супрацоўнікаў, а ў акруговых і раённых – 36 %, то ўжо ў 1927 г. – 80 і 70 % адпаведна [1, с. 148].

Да 1928 г. справаводства на беларускую мову было пераведзена амаль поўнасцю. Асноўныя ўнутрырэспубліканскія дакументы выдаваліся на чатырох мовах, агульнасаюзныя – на беларускай і рускай, грамадска-прававыя дакументы (пасведчанні і інш. ) – на беларускай і адной з трох раўнапраўных моў.

Адным з цэнтральных накірункаў беларусізацыі стала карэнізацыя – выхаванне і вылучэнне кадраў з карэннага насельніцтва на партыйную, савецкую, прафсаюзную і грамадскую работу. У 1929 г. у выніку правядзення карэнізацыі доля беларусаў у адміністрацыйных установах складала 51,3 %, рускіх – 18, яўрэеў – 24,8, палякаў – 0,1, іншых – 5,8 %. У цэнтральным савецкім апараце доля беларусаў складала 32,5 %, рускіх – 24,2, яўрэеў – 36,8 %. У гаспадарчых установах беларусаў налічвалася 30,8 %, рускіх – 13,1, яўрэеў – 49,3, палякаў – 1,1, іншых – 5,7 % [2, с. 64].

Для нацыянальных меньшасцей, што пражывалі на тэрыторыі Беларусі, стваралася сістэма так званай экстэрытарыяльнай аўтаноміі, якая прадугледжвала арганізацыю сельскіх і гарадскіх нацыянальных Саветаў там, дзе пражывала больш чым 500 прадстаўнікоў той ці іншай нацыянальнасці. Калі ў 1924 г. у Беларусі існавала ўсяго 9 нацыянальных Саветаў (7 яўрэйскіх і 2 латышскіх), то ў 1929 г. – 67 (23 яўрэйскіх, 19 польскіх, 16 рускіх, 5 латышскіх, 2 украінскіх і 2 нямецкіх) [3, с. 32]. Там, дзе жыло больш за 10 тысяч прадстаўнікоў гэтых народаў, ствараліся нацыянальныя раёны, на тэрыторыі якіх ажыццяўлялася свая мінінацыяналізацыя і мінікарэнізацыя.

У баку ад беларусізацыі не засталіся нават такія цэнтралізаваныя арганізацыі, як Узброеныя сілы. Пераважна на беларускай мове вяліся заняткі ў беларускіх вайсковых частках, выпускаліся насценгазеты, афармляліся матэрыялы нагляднай агітацыі, уводзілася вывучэнне беларускай мовы. Для падрыхтоўкі беларускіх камандных кадраў была створана Аб'яднаная беларуская ваенная школа каманднага саставу ім. ЦВК БССР, якая ўжо да 1928 г. на 75% была ўкамплектавана курсантамі-беларусамі [4, с.19].

Вядучым накірункам беларусізацыі стала развіццё беларускай мовы. Яшчэ ў лютым 1921 г. была створана Беларуская навукова-тэрміналагічная камісія, якая і павінна была распрацаваць беларускую тэрміналогію. За кароткі час агульнымі намаганнямі былі падрыхтаваны і выдадзены тэрміналагічныя слоўнікі па асноўным галінам навукі, распрацоўкі па лексіцы і граматыцы беларускай мовы, дапаможнікі для школ, тэхнікумаў, інстытутаў. Менавіта тады былі закладзены асновы сучаснай беларускай мовы.

У комплексе распрацаваных мерапрыемстваў па беларусізацыі грамадскага жыцця у краіне першапачарговая ўвага надавалася сістэме народнай адукацыі. Да 1928 г. каля 80 % школ было пераведзена на беларускую мову навучання. Побач з беларускімі адкрываліся школы і класы з роднай мовай навучання для прадстаўнікоў нацыянальных меньшасцей – рускіх, яўрэяў, палякаў, украінцаў і інш. У 1927 г. навучанне ў школах Беларусі вялося на васьмі нацыянальных мовах.

З мэтай вырашэння праблемы падрыхтоўкі выкладчыцкіх кадраў у акругах і раёнах адкрываліся кароткатэрміновыя курсы па методыкам выкладання беларускай мовы, арыфметыкі, гісторыі Беларусі, геаграфіі і інш. Да 1927 г. праз такія курсы прайшло 75 % настаўнікаў [5, с. 30-31].

У 1920-я гады былі ўтвораны першыя навуковыя ўстановы (Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Інстытут беларускай культуры і інш.), фарміраваліся кадры вучоных. Важнай падзеяй ў навуковым і грамадскім жыцці рэспублікі стала адкрыццё ў 1929 г. Нацыянальнай Акадэміі навук.

Павелічэнне попыта на кнігі і падручнікі прывяло да ўзнікнення Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі, у планах якога прадугледжвалася выданне літаратуры на мовах усіх нацыянальнасцей, што пражывалі на тэрыторыі Беларусі. На беларускую мову паступова перакладаліся газеты і часопісы. Таксама пашыраўся перыядычны друк і на мовах нацыянальных меньшасцей. У 1928 г. з 17 рэспубліканскіх газет 9 выдаваліся на беларускай мове, 4 – на рускай, 2 – на польскай, 1 – на яўрэйскай, 1 – на літоўскай [3, с. 29-30].

У гэты час ўзніклі і дзейнічалі такія літаратурныя аб’яднанні, як “Маладняк”, “Полымя”, “Узвышша”, яўрэйская літаратурная група “Юнгер Арбэйтэр” (“Малады рабочы”).

У 1924 г. быў прыняты дэкрэт СНК БССР аб стварэнні Дзяржаўнага ўпраўлення па справах кіно, што стала пачаткам існавання беларускага кінематографа.

У 1920-я гады быў закладзены фундамент беларускага нацыянальнага тэатра, які фарміраваўся на драматургіі К. Каганца, Я. Ку-

палы, Я. Коласа, К. Буйло, Ф. Аляхновіча і інш. У 1929 г. у Беларусі працавала шэсць тэатраў – тры Беларускіх дзяржаўных, Дзяржаўны яўрэйскі тэатр, Яўрэйскі і Польскі перасоўныя тэатры, а таксама шматлікія студыі і аматарскія тэатральныя калектывы.

Дзякуючы арганізацыі рэгулярнай дзейнасці Ўсебеларускіх мастацкіх выстаў, набывае вядомасць беларускае выяўленчае мастацтва.

Разам з тым у другой палове 1920-х гадоў у Беларусі побач з беларусізацыяй ішоў і другі працэс – набіраў сілу дагматызм, у духоўным жыцці зацвярджаліся забароны, усё настойлівей сталі укараняцца ўстаноўкі і прынцыпы, якія скажалі сутнасць беларусізацыі.

Гэтыя прцэсы былі цесна звязаны са згортваннем нэпа. Менавіта ў другой палове 1920-х гадоў стала згортвацца нэпаўская мадэль развіцця сацыялізму, што не магло не адлюстравацца на ідэалагічнай дзейнасці партыі. Усё часцей нацыянальнае свядома сталі атаясамліваць з нацыяналістычным, з падазрэннем адносіцца да любых праяў нацыянальных пачуццяў і турбоце аб развіцці нацыянальнай культуры і мовы. Значная частка прадстаўнікоў дзяржаўнага апарату разглядала беларусізацыю, як і нэп, з’яваю часоваю, як адступленне ад ідэі сусветная рэвалюцыі, якая, на іх думку, непазбежна павінна была знішчыць усе нацыянальныя адрозненні і дзяржаўныя межы. Таму відавочна было памкненне трымаць працэс нацыянальнага культурнага будаўніцтва пад сваім кантролем.

Менавіта ў другой палове 1920-х гг. у адрас беларускай інтэлігенцыі ўсё часцей сталі гучаць абвінавачванні ў тым, што яна прытрымліваецца ідэалогіі “нацыянал-дэмакратызму”. Па меры згортвання НЭПа, вяртанне да адміністрацыйна-камандных форм кіравання барацьба з інтэлігенцыей станавілася афіцыйнай палітыкай. Палітычныя адзнакі нацыянал-дэмакратызму сталі ненатуральна завастрацца аж да правядзення аналогіі з нацыянал-фашызмам.

З умацаваннем адміністрацыйна-каманднай сістэмы палітычныя адзнакі нацыянал-дэмакратызму станавіліся ўсё больш вострымі, і неўзабаве справа дайшла да сур’ёзных абвінавачванняў вялікай групы беларускай інтэлігенцыі аж да абвяшчэння яе праціўнікам савецкага ладу. Апагеем гэтай кампаніі стала справа “Саюза вызвалення Беларусі”, за прыналежнасць да якой у канцы 1929 г. было асуджана 90 чалавек, галоўным чынам, работнікі навукі, культуры, мастацтва і шэрагу наркаматаў рэспублікі, якія сваёй мэтай нібыта ставілі звяржэнне савецкай улады і ўстанаўленне беларускай буржуазнай дзяржаўнасці.

Кампанія па барацьбе з нацыянал-дэмакратызмам нанесла вялікую шкоду беларусізацыі. У рэспубліцы пачаўся адваротны працэс:

скарачаецца колькасць беларускамоўных школ, народных дамоў, хат-чытальняў, змяншаецца выданне беларускіх кніг, справаводства ў розных установах пераводзіцца на рускую мову і інш.

Такім чынам, адмова ад новай эканамічнай палітыкі, агульны пераход да адмініcрацыйна-камандных метадаў кіравання грамадствам непазбежна прывялі да дэфармацыі ў нацыянальна-культурнай сферы. Беларусізацыю, як і шмат якія іншыя прагрэсіўныя пачынанні, моцна падарвала барацьба з г. зв. "нацдэмамі", а канчаткова яе задушылі рэпрэсіі 1930-х гг.

ЛІТАРАТУРА

1. Нацыянальны архіў РБ. Ф. 4, воп. 7, спр. 274.

2. Два гады нацыянальнай работы ў БССР: збор прамоў, артыкулаў і рэзалюцый па нацыянальнаму пытанню. – Мн.: Выд-ва Нацыянальнай камісіі ЦВК БССР, 1929. – 167 с.

3. Асноўныя вынікі работы ўраду БССР. Да перавыбараў Саветаў. 1928 – 1929. – Мн.: Выд-ва ЦВК і СНК БССР, 1929. – 150 с.

4. Практычнае вырашэнне нацыянальнага пытання ў БССР. – Мінск: Выд-ва Нацкамісіі ЦВК БССР. – ч. І. Беларусізацыя. – 1928. – 152 с.

5. Нацыянальны архіў РБ. Ф. 42, воп. 1, спр. 1584.

УДК 351.756(438)«1918/1939»

В.У. Коваль, дац., канд. гіст. навук,
(БДТУ, г. Мінск)

## СТРУКТУРА ДЗЯРЖАЎНЫХ ОРГАНАЎ ЭМІГРАЦЫЙНАГА АПАРАТУ ДРУГОЙ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

Даследаванне гісторыі эміграцыйнай міжваеннай хвалі беларускага насельніцтва вымушае спецыялістаў разглядаць як эканамічныя, палітычныя, псіхалагічныя аспекты, так і прававыя асаблівасці працэдуры эміграцыі. У Другой Рэчы Паспалітай праблемамі эміграцыі і рээміграцыі займаліся структуры Міністэрства працы і сацыяльнай апекі, Міністэрства замежных спраў, Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства фінансаў, Міністэрства прамысловасці і гандлю.

Эміграцыйны апарат Польшчы фарміраваўся паэтапна, на яго дзейнасць значны ўплыў аказвала ўнутраная і знешняя палітыка дзяржавы. У 1919 г. было створана Дзяржаўнае бюро па працаўладкаванню пры Міністэрстве працы і сацыяльна апекі, якое з 1920 г. пачало падпарадкоўвацца Эміграцыйнаму